# УСПАМІНЫ ПРА В. Ф. КАПЫЦІНА (запісаны ў 2003–2004 гадах)

*Аляксандр Агееў*

## "ШЭФ" (УСПАМІНЫ ПРА В. Ф. КАПЫЦІНА)

На раскопкі з Вячаславам Фёдаравічам я ў студэнцкія гады не ездзіў, аб чым, дарэчы, заўсёды шкадаваў. У той год хлопцы нашага курса паехалі будаваць кароўнік у Смаленскай вобласці, і на раскопы мы паехалі ўжо восенню пад кіраўніцтвам навукоўца з Акадэміі навук Беларусі. А вось разведку з Капыцiным па Клічаўскім раёне вясной 1978 г. мы запомнілі на ўсё жыццё. Нічога надзвычайнага тады не адбылося, але свежыя адчуванні маладосці, як чароўныя карцінкі і сёння са мною. Прыгожыя вясеннія сасновыя бары, рамантычныя вечары ля вогнішча, бадзянне па лясах у пошуках археалагічных адкрыццяў... Што можа быць лепей?!

Відаць, не менш, чым нам, падабалася такое жыццё і Вячаславу Фёдаравічу. Ён быў зусім не такі, як у інстытуце, дзе барада, касцюм, гальштук рабілі яго вонкава строгім і недасяжным для баязлівых першакурснікаў. Тут жа перад намі прадстаў жвавы, вясёлы, аптымістычны і адкрыты малады навуковец. Ён многім з нас адразу даў "мянушкі". Запомнілася градацыя нашых дзяўчат на "старшых", "рабочых" і "любімых" жонак. Як ні дзіўна, дзяўчаты не крыўдзіліся. Наадварот, са смехам падыгрывалі яму. Так весела і запамінальна праляцелі тры дні разведак.

Манеру Вячаслава Фёдаравіча размаўляць можна было б назваць "візантыйскай". Нетаропкасць, шматзначнасць і афарыстычнасць сапраўды рабілі яе ў нечым падобнай на ўсходнія ўзоры. Але адсутнасць такой уласцівай многім усходнім прамоўцам квяцістасці, шматслоўнасці прымушала сумнявацца ў гэтым вывадзе. Уменне выказвацца коратка і дакладна нагадвала і паўночную "варажскую" манеру. Праца патрабавала камунікацыі, і выступаў ён часта, з густам і не баючыся аўдыторыі. Умеў знаходзіць трапныя словы, нечаканыя нюансы праблемы, павярнуць гутарку ў іншы бок і, амаль абавязкова, жартаваць пры гэтым. Менавіта дзякуючы гэтаму ўсе яго выступленні заставаліся ў памяці. "Шэф" мог дабіцца свайго ў сітуацыі невідавочнасці яго праваты, пераканаць суразмоўцу, які лічыў інакш.

Не ведаю, з якога часу Капыціна пачалі называць "ШЭФ", але такі зварот на роднай для яго кафедры ўсеагульнай гісторыі, а потым і на кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін трывала замацаваўся. У ім гучала павага не толькі да ўзросту ці пасады, што ён займаў, але і прызнанне навуковага аўтарытэту, эрудыцыі і высокіх чалавечых якасцяў.

Майстар паўзы – Вячаслаў Фёдаравіч лічыўся адным з лепшых гумарыстаў гістфака. Шматлікія і заўжды трапныя жарты на лекцыях зрабілі археалогію, не такую багатую на цікавыя факты, як многія іншыя гістарычныя курсы, адным з самых папулярных прадметаў на гістфаку.

Цяжка ўявіць вечарыны 1990-х гадоў на факультэце без тостаў Вячаслава Фёдаравіча. Ён быў прынцыповым праціўнікам доўгіх, мудрагелістых прамоў – фактычна маральна-гістарычных апавяданняў, якія былі ўласцівы навуковаму асяроддзю ў 1970–80-я гады. Ягоным прынцыпам было іншае: тост, на яго думку, павінен быць як спадніца ў дзяўчыны: дастаткова кароткай, каб спакушаць, але і дастаткова доўгай, каб прыкрыць сорам.

На вечарынах гістфака ў апошнія гады Вячаслав Фёдаравіч абсалютна не ўжываў алкаголю, а келіхі ўздымаў з мінералкай. Трэба адзначыць, што я ніводнага разу не бачыў яго п'яным. Таму мяне заўсёды здзіўлялі размовы аб тым, што калі-нікалі Вячаслаў Фёдаравіч можа дазволіць сабе лішняе. Я думаю, што чуткі, як звычайна, былі перабольшаннем. Хаця сам "шэф" любіў паўтараць: "Я сваю бочку спірту ўжо выпіў". У апошнія гады ён, відаць, адчуў, што навуковыя задачы, якія ён ставіў перад сабой, – складанне археалагічнай карты Магілёўшчыны і абарона доктаркскай дысертацыі – могуць быць не выкананымі. Ужыванне спіртных напояў забрала б такі неабходны для навукі час. Ды і здароўе ўжо было не маладое. Скакаў ціск. Некалькі разоў "шэф" трапляў у шпіталь. Таму Вячаслаў Фёдаравіч, як чалавек валявы, мэтанакіраваны, проста забараніў сабе піць. Сярод маіх сваякоў хапала тых, хто злоўжываў спіртным, і я не па расказах ведаю, як на самой справе нялёгка прыпыніцца людзям, якія раней дазвалялі сабе залішняе. Вячаслаў Фёдаравіч быў для мяне ўзорам таго, што чалавек, захоплены ідэяй, любімай справай, здольны нават на такі ўчынак.

Я прыйшоў на працу ў педінстытут на пачатку 1990-х гадоў і запомніў Капыціна гладка паголеным, у касцюме і чыстай кашулі з гальштукам. Неад'емнай у апошнія гады дэталлю была і цыгарэта. Нягледзячы на загад аб забароне курэння ва ўніверсітэце, Вячаслаў Фёдаравіч спачатку ў канцы калідора, а потым у лабаранцкай са смакам дазваляў сабе асалоду парушэння дысцыпліны.

Са шпіталямі ў "шэфа" былі свае няпростыя ўзаемаадносіны. Першы раз я наведваў Вячаслава Фёдаравіча ў бальніцы яшчэ студэнтам у 1980-м, ці 1981-м годзе. Ужо тады ён трапіў у кардыялогію, бо даймала сэрца. Калі ў 1990-я гады мая жонка зламала нагу, і я шукаў мыліцы, то знайшоў іх у Вячаслава Фёдаравіча, які толькі што залячыў свой чарговы перелом. Мы пачалі размаўляць аб траўмах, і ён налічыў у сваім жыцці, калі памяць мяне не падманвае, больш за дзясятак розных пераломаў.

На святкаванні яго шасцідзесяцігоддзя ва ўніверсітэце шматлікія віншаванні, у тым ліку начальнікаў абласных упраўленняў адукацыі і культуры, прадстаўнікоў КДБ, святочныя клопаты зноў прывялі да крызісу. Пасля афіцыйнай часткі "шэфу" стала кепска. Ён амаль страціў прытомнасць. Дактары "хуткай дапамогі" настойвалі на тэрміновай шпіталізацыі. Але як толькі Вячаславу Фёдаравічу стала крыху лепей, то ён настаяў на пачатку банкету ў рэстаране "Турыст". Усе мы, запрошаныя на юбілей госці, вымушаны былі пагадзіцца, бо было зразумела, што зрыў мерапрыемства, у якое было ўкладзена юбілярам столькі сіл і сродкаў, стане для яго яшчэ большым ударам. Вячаслаў Фёдаравіч пабыў з намі 30 хвілін (увесь час каля ганку яго чакала спецыялізаваная кардыялагічная "хуткая дапамога") і з'ехаў у шпіталь.

Выхад на пенсію, прызнанне яго чалавекам года, добрыя і высокія словы, якія ён пачуў на святкаванні свайго шасцідзесяцігоддзя, правядзенне ў яго гонар у канцы студзеня – пачатку лютага 2002 г. спецыялізаванай міжнароднай навуковай канферэнцыі надалі Вячаславу Фёдаравічу новыя сілы. Нармалізавалася здароўе. Па выніках апытання на лепшыя гістарычныя працы Магілёўшчыны, якое сярод гісторыкаў і краязнаўцаў праводзіла рэдакцыя альманаха "Магілёўская даўніна" у сувязі з пачаткам трэцяга тысячагоддзя, "Археалагічныя помнікі Магілёўскай вобласці" В.Ф. Капыціна занялі ганаровае чацвёртае месца. Вышэй рэспандэнты паставілі толькі "Вопыт апісання Магілёўскай губерні...", Баркалабаўскую і Магілёўскую хронікі. Вячаслаў Фёдаравіч разважаў аб сваіх перспектыўных навуковых планах, відавочна адчуваў унутраны ўздым. На працы шэф стаў яшчэ больш спакойным, ветлівым і ўраўнаважаным.

Але набліжаўся чарговы палявы сезон. Рэктар, дэкан прасілі Вячаслава Фёдаравіча ў гэтым годзе не ездзіць у поле. З улікам яго здароўя і таго, што лета 2002 года выдалася надзвычай гарачым, гэта было б цалкам натуральным. Натуральным гэта было б для многіх, напэўна для большасці з нас, але толькі не для яго. Нягледзячы на тое, што страшэнная спёка стаяла ўвесь ліпень–жнівень, шэф паехаў у свой апошні археалагічны сезон. Разведкі і сама практыка прайшлі планава. А вось пасля іх здароўе Вячаслава Фёдаравіча пагоршылася фатальна... Спраўдзіліся словы, якія падчас адных з раскопак ён жартам сказаў студэнтам: "Я, напэўна, і памру ў раскопе".

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова